## Хаутуры.

В. Тез-ков так апісывае у газэце „Старый Влад.“ пахаваньне афяр згінуўшых у стычцэ з адбітым намі аўстрыяцкім набегам на Уладзімір Валынскі:

„Дзесяць дамавін, вынесенных афіцэрамі. У дамавінах восім праваслаўных, адзін каталік і адзін жыд. За дамавінамі—праваслаўные сьвяшчэнікі, ксёндз і рабін.

Рэдкае еднаньне вер!

Сумуець і прырода—марусіць дробны, чуць прыметны дождж...

Аддаць апошнюю паслугу таварышам на магілкі прызначэна адна рота. Рэшце скамандавана: „У казармы, адзевацца ў паход“.

Забітаго жыда аддзялілі па дарозе на жыдоўскіе магілкі. А ўсіх апошніх пахавалі на праваслаўных магілках у брацкай магіле. Пад пеяньне „Сьвяты Божэ“, военную музыку і залпы з ружжаў, апусьцілі героеў у магілу. Борзда вырас насып, пакрыты кветкамі.

Сьпіце спакойна, вы, што аддалі жыцьцё за шчасьце, свабоду другіх!

Вечэрам с такім-жэ ваенным гонарам былі пахаваны на тых-жэ магілках восем забітых аўстрыякоў, пакінутых на полі бітвы сваімі таварышамі. У сумеснай магіле, недалёка ад сваіх згінуўшых праціўнікоў нашоў сабе вечны супакой і аўстрыяцкі афіцэр, што насіў на грудзях знакі чулаго каханьня к пакінутай на бацькоўшчыне сваей нявесьце. Там-жэ пахаваны і славак, што пісаў нядаўна да бацькоў аб сваім добрым здароўі. За дамавінамі таварышоў шоў, патупіўшы галаву, узяты у палон аўстрыяцкі гусар. На некаторые дамавіны быўшых ворагоў жаласьлівая душа палажыла вянкі з жывых кветак.

Сьпіце спакойна і вы, хорваты, словакі, што благой долей сталі нашымі ворагамі!

## З Беларусі і Літвы.

### З Віленшчыны.

**Запамогі семьям запасных.** С 6 верэсьня у Вільні пачалі выдаваць казённые запамогі (пайкі) семьям запасных і ратнікоў апалчэньня, пакліканых на вайну. Запамогі выдаюцца па чародзі і акуратна. У Вільні завязаўся гурток адвакатоў, які даець дарма праўные саветы семьям запасных.

**Тэлеграмы у Галіцію.** Цяперака за тэлеграмы у заваеваную Галіччыну прызначэна плата 5 кап. за слова, як і ў іншые мейсцы Расеі. Перш трэбало плаціць, як за граніцу—11 кап. за слова.

**На прызыў.** Сёлета ў г. Ашмянах прызыў на ваенную службу будзе адбывацца у такіе дні: 3-ці прызыўны участак 1 кастрычніка (акцября), 2-гі участак 12 кастрычніка і 3-ці участак 22 кастрычніка. На прызыў павінны станавіцца ўсе дзяцюкі што радзіліся ў 1893 г.

**На вайну.** У Вільні на чугунцэ паліція затрымала 15-летнюю дзяўчынку с Петрограду, каторая уцекла ад бацькоў, каб запісацца ў санітаркі на полі вайны. А колькі часу таму назад з Вільні уцяклі 3 дзяўчыны на вайну.

### З Міншчыны.

**Весткі аб вайне.** Мінская Паветовая земская управа поруч з іншымі земскімі управамі атрымлівае дарма тэлеграмы петроградзкаго тэлеграфнаго агенства. Управа што дзень спісывае з гэтых тэлеграм копіі каля 160 штук і разсылае іх у валасьці па 10 шт. у кожную.

**Праца ваенна-палонных.** Шмат паветовых земствоў Мінской губ. старaецца перад урадам аб прысылцы палонных на будову шасэйных дарог і на іншые земскіе работы.

**На раненых.** Мінская гарадзкая управа наладзіла 23 бальніцы на 5000 раненых, якіх ужо і размешчана ў гэтых бальніцах. У Мінску, с прычыны немалога наплыву раненых, паразсыланы па ўсіх урадовых установах патпісные лісты для дабравольнай патпіскі жадаючых прыняць к сабе ў хату раненых. Усерасейскі земскі хаўрус аткрыў стаянкі для харчоўкі і перэвязкі раненых у Барысаве, Барановічах, Бабруйску і Пінску.

**На семьі запасных.** У Мінску між іншымі завязаўся польскі гурток запамогі семьям запасных. Першае мейсцэ у гэтых гуртку узяла на сябе княгіня Магдалена Радзівілл. Гэта-ж княгіня уладзіла у сваім дварэ Жарноўцы прыпынак на сто дзяцей запасных с поўным іх утрыманьнем.

**Ваенная здабыча.** 6 верэсьня у Мінск даставілі два здабытые на вайне самалёты—аўстрыяцкі і нямецкі.

**Новая вучэльня.** У Барысаве пазволена залажыць жаночную вучыцельскую сэмінарыю.

**Пад суд.** Цягнуць пад суд за праступкі па службе такіх служакоў мешчанскіх управаў мінск. губ.: члена бабруйскаго управы Жука, пінскаго мешчанскаго старасту Макеева, прадседацеля давід-гарадзецкай управы Каленко і быўшых членоў гэтай управы Гурвіча і Грычына, старасту ад зборкі павіннасьцей м. Капыль Снітко, гарадоцкаго мешчанскаго старасту Хэймана, брагінскаго мешч. старасту Дыніна, зембінскаго мешч. старасту Файтэльсона і урэцкаго мешч. старасту Пэсіна.

**За храбрасьць** Засадзілі на 3 месяцы пад арышт жыхарку м-ка Докшыц Ханку Поляк за неўвагу і дзёрскую выхадку к паліцейскаму чыну.

**За доўгі язык.** На паню двара Новая Земля, пагішынскай вол. пінск. пав., Алену Сташэвічыху і яе дачку Алену Сташэвічышку „за распаўсюжываньне баламутных чутак аб вайне“ наложана штрафу 2000 руб. або пасядзець па два месяцы кожнай. За гэта-ж самае па загаду губэрнатара сеў на 3 месяцы бабруйскі жыхар—Мэглянд.

**Вайна з гарэлкай.** На мінскаго жыхара Лявона Бурлакова налажылі штрафу 50 руб. або на 2 нядзелі пад арышт за тое, што ён лазіў па вуліцы пьяны і буяніў. У Мінску аштарафавалі на 3000 руб. рэстаран „Парыж“ (даўней Саулевіча) за продаж спіртных напіткоў у забароненым часе. Засадзілі на тры месяцы пад арышт за патайную продаж гарэлкі і піва мешчан г. Бабруйска Г. Матусона і Х. Найманаву, селянку барысаўскаго пав. Альжбету Анушкевіч, селяніна вёскі Лістопадавіч слуцкаго пав. Л. Грыцэвіча, жыхароў м-ка Барановічы—А. Косеродзкую, М. Яроцкаго, П. Несвіжскаго і Б. Абрамовіча.

Селянскіе обчэствы барысаўск. пав хлапочуць аб скасаваньні казённых манаполек і прыватных шынкоў у 460 вёсках і забароне аткрываць новые. Брагінскі валасны сход прыгаварыў старацца аб закрыцьці ўсіх манаполек і шынкоў у валасьці. У Ракаве, мінск. пав., сход прыгаварыў закрыць усе казёнкі і шынкоўні у мястэчку і валасці. Селяне вёскі Юр‘ева, барысаўск. пав, хлапочуць аб закрыцьці манапалькі ў іх сяле.

**За соль і каўбасы.** У Мінску аштрафавалі крамніка Ш. Яблонка на 100 руб. або дзьве нядзелі пасядзець за тое, што ён без патрэбы падняў цану на соль. У Несвіжы за гэта самае аштрафавалі гандляра каўбасамі на 200 руб. або месяц пад арышт.

**Пажары.** У Пінску надовічы пажар знішчожыў 4 дамы і склад машын да шыцьця Зынгера. Згарэла 334 машынкі. Шкоды каля 100,000 р. У Бабруйску згарэў тартак (лесапільны завод) Эткіна, піваварня Любэцкаго, а такжэ 40 хат на прадмесьці. Шкоды вялікіе.

**Брат на брата.** У засьценку Шчэрбіны рэчыцк. пав., селянін Васіль Нікіценко, завадзіўшыся с сваім братам Кузьмой, выстрэліў ў яго і раніў.

**Падмена арыштанта.** Надовічы у Мінску заместа затрыманаго дэзэртыра (уцекача з ваеннай службы) даставілі нейкаго так угалоўнаго праступніка. Воінскі начальнік вярнуў арыштаванаго у паліцію.

### С Ковеншчыны.

**Пад суд.** Цягнуць пад суд стражніка з вількамірскаго пав. Ковенскай губ., Язэпа Астроўскаго за тое, што сазаджанаму у халодную П. Рамаоўскаму патурбаваў кольбай ад стрэльбы галаву і паламаў левае плячо.

## З усіх старон.

**Аб прызыве.** Сёлета прызыў на ваенную службу пачынаецца с 1-го кастрычніка (акцябра). Належачые к прызыву павінны яўляцца у свае вучасткі ўсе тые дзяцюкі, што радзіліся у 1893 гаду.

**Казённые дровы.** Дармавы павал с казённых лясоў для бяднейшых семьяў запасных і ратнікоў пакліканых на вайну выдаецца у такім парадку: 1) ня болей трох кубічных сажняў на кожную сямью; 2) пазваленьне на казённые дровы трэба мець ад свайго земскаго начальніка і 3) білеты на бесплатную рубку выдаюцца не аднаму дравасеку, а цэламу гуртку.

**Сэрвітуты.** Міністэрства унутрэнніх спраў загадала губэрнатарам акуратна дапільновываць сурвітутнаго права, з якога карысталі запасные пакліканые на вайну, каб двары ня крыўдзілі ў гэтым семьяў запасных.

**Аб народных вучыцелях.** Пакліканые на ваенную службу народные вучыцелі будуць усё роўна атрымліваць сваю пэнсію ці самі, ці іх семьі. Мейсцы, на якіх служылі, астаюцца за імі.

**Багаж запасных.** Міністр дарог загадаў не прадаваць да канца вайны с таргоў просрочанаго багажу, належачаго да пакліканых на вайну.

**Аб багажы.** Загадана чыгункам не прыймаць праз увесь час вайны болей як 10 пудоў багажу к аднаму білету I клясы і 5 пудоў к білетам II і III кляс.

**Налог на білеты.** Маняцца на час вайны павялічыць плату на білеты за праезд чыгункай на 25 працэнтоў (25 кап. на адзін рубэль).

**Аб санітарах.** Главнае Упраўленьне „Чырвонаго Крыжу“ апавесьціло, што ў санітары прыймаюцца толькі ваенныа ніжніе чыны (салдаты) і тые, што будуць залічэны дабравольцамі на дзействіцельную ваенную службу.

Пэнсію сёстрам міласэрдзя, якіе акончылі шасьцінядзельные курсы, прызначыў Чырвоны Крыж па 30 р. у месяц апрача харчоў.

**На раненых.** Па ўсей Расеі бяз ліку робюць складкі і арганізуюць лазарэты для раненых. Гэтак, хаўрус губэрскіх земствоў сабраў 6 мільёноў рублёў на раненых. Адно курскае губэрскае земство адлічыло на раненых 1 мільён. Курскі губэрнатар с прычыны перапоўненьня бальніц зьвярнуўся з заклiканьне к жыхарам прыймаць к сабе на кватэры выздараўліваючых раненых. У Петроградзе граданачальнік даў гарадзкому хаўрусу спісак гасцінніц і рэстараноў, якіе можна перамяніць у лазарэты. У Рызе так сама колькі рэстараноў перэмянілі у лазарэты. У Петроградзе, Маскве, Курску і другіх гарадох падыймаюць цытаньня аб перамене казённых вінных складоў у лазарэты для раненых.

**Тайфун (навальніца).** Над прыморскай обласцяй каля Уладывастоку тры дні шалеў тайфун с страшэннай улевай. З гор і даліны хлынула сцена вады 12 аршын вышынёю. Вадою заліта паляна каля 1000 вёрст квадратных (у доўжкі і ў шыр). Згінула 220 людзей, тысячы штук жывёлы, пашкоджэна чугунка, змыты дзясяткі вёсак, усе запасы, увесь ураджай сена і збожа. Шкоды аблічываюць на мільёны рублёў. Некаторые мейсцы астануцца на доўга затопленымі. Згінулі саўсім вялікіе сёлы, парабіліся грамадные азёры. Край асуджэны на голад.

— Над Севастопалем так сама шалела тры дні улева. Затоплены нізіны, сутарэні ў дамох, сады, агароды. Шкоды грамадные. На моры бушэваў шторм.

**Змаганьне з дарагоўлей.** Пад штрафам 3 тысяч руб. або 3 месяцы арышту петроградзкі губэрнатар выдаў пастанову не прадаваць даражэй сена як 1 руб. за пуд, а салому 50 к. за пуд.

**Заказ у Амэрыцэ.** Міністэрство дарог с прычыны неакуратнасьці расейскіх фабрык маніцца заказаць у Амэрыцэ 10 тыс. вагоноў. Гэтак вагоны абойдуцца дзешавей і хутчэй будуць гатовы.

**Жулік навейшаго гатунку.** У Харкаўшчыне арыштавалі ягомосьця, чыноўніка-самазванца, які разьежджаў і запісываў хто хочэ перасяліцца у заваеванную Галіччыну, дзе быццам дарма будуць раздаваць зямлю. Пры гэтым браў ад патпісаўшыхся „казённые пошліны“.

**Грамадзянскі камітэт.** У Варшаве генерал-губэрнатар зацьвярдзіў «Польскі цэнтральны камітэт грамадзянскі». Пастановы камітэту будуць важнымі, як і ўраду.

**Уніяцкі мэтрапаліт.** У Кіеве прыгатаўляюць пакоі для маючаго сюды прыехаць уніяцкаго мэтрапаліты.

Рэдактар-Выдавец

І. Луцэвіч.

Друкуецца і скора выйдзе

# „БЕЛАРУСКІ КАЛЕНДАР“

## на 1915 год.

Календар друкуецца двума асобнымі выданьнямі: рускімі і лацінскімі літэрамі, з іншым у кожным тэкстам.

Заказы на календар трэба прысылаць загадзе у „Беларускую Кнігарню“, Вільня, Завальная № 7.

**Прыймаюцца ў календар на сходных варунках абвесткі.**

Друкарня Марціна Кухты, Татарская 20.